ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989 ЧАЦВЕР 28 ВЕРАСНЯ

№ 25 (1618)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ТЭЛЕТАЙП

## АБ ЗМЕНЕ СТРУКТУРЫ

партыйнай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна ішла размова на пасяджэнні бюро парткома. Падставай для стварэння партыйнай арганізацыі філасофска-эканамічнага факультэта з правамі пярвічнай стала адкрыццё ва універсітэце філасофска-эканамічнага факультэта. Праўда, немалаважную ролю адыгралі крытычныя заўвагі і прапановы па структуры партыйнай арганізацыі універсітэта, якія зыходзілі ад ніжэйшага звяна — пярвічных партарганізацый і асобных камуністаў, а таксама неабходнасць выканання рашэнняў VI справаздачна-выбарнай партыйнай канферэнцыі БДУ.

У састаў партыйнай арганізацыі філасофска-эканамічнага факультэта вырашана ўключыць партарганізацыі наступных кафедраў: марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў, палітэканоміі гуманітарных факультэтаў, палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў, гісторыі філасофіі і логікі, марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

## «РЫХТУЙ САНІ ЛЕТАМ!»

— сцвярджае народная мудрасць. Прытрымліваюцца гэтай аксіёмы і члены вучонага савета БДУ.

Таму і вынеслі на парадак дня пасяджэння вучонага савета наступнае пытанне: вынікі прыёму студэнтаў на першы курс у 1989 годзе і задачы універсітэта па папярэдняму адбору абітурыентаў у выпускных класах сярэдніх школ і арганізацыі прыёму ў 1990 годзе.

Т. ДОЎНАР.

## ПАВАЖАНЫ ПЕРШАКУРСНІК!

Калі ты хочаш за час вучобы ва універсітэце атрымаць яшчэ адну прафесію, прыходзь на ФГП. Ён дапаможа табе стаць:

— лектарам-прапагандыстам таварыства «Веды»;

— арганізатарам фізкультурна-масавай і спартыўнай работы;

— арганізатарам работы з дзецьмі і падлеткамі;

— арганізатарам культурна-асветніцкай работы;

— арганізатарам турысцка-экскурсійнай работы або інструктарам-метадыстам па турызме;

— выкладчыкам стэнаграфіі.

Тэрмін навучання — 1 год.

Жадаючым дастаткова звярнуцца ў камітэт камсамола свайго факультэта або ў дэканат факультэта грамадскіх прафесій (вул. Бабруйская, 9, пакой 61).

Э. ДАНІЛАВА.



*Яшчэ некалькі тыдняў назад пяцікурсніца ФПМ Наташа Цагойка была байцом будатрада «Лятучы галандзец». Зараз Якуцкі край, далёкія мясціны за Палярным Кругам, дзе давялося працаваць, сябры-будатрадаўцы жывуць ва ўспамінах. Вучыцца Наташы засталося зусім нямнога, да лістапада, потым, пасля апошняй сесіі — пераддыпломная практыка. Для будучага праграміста гэты год — развітальны з універсітэтам.*

*Фота С. ГРЫЦА.*

НЕАДКЛАДНА!

## ЧАКАЕМ ПЕРАМЕН

Усё пачалося з таго, што мы маем звычку маўчаць. Калі ўсе разам — здаецца, незадаволены, а калі адзін на адзін — «Скаргаў і заяў не маю!» Яно зразумела: венік прасцей па пруточку паламаць.

11 верасня (чытайце «Беларускі універсітэт», № 24) прадстаўнікі розных факультэтаў сабраліся разам, каб высветліць адносіны рэктарата да Указання «Аб ваеннай падрыхтоўцы студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, звольненых з ваеннай службы».

Камень спатыкнення — заўважаная студэнтамі несправядлівасць: той, хто не адслужыў у арміі вызначаны тэрмін, вызваляецца па жаданню ад ваеннай падрыхтоўкі, той жа, хто прайшоў вайсковую школу цалкам, абавязаны асвойваць і афіцэрскую спецыяльнасць, іначай не зможа быць ні фізікам, ні юрыстам, ні філалагам. Дыялог паміж студэнтамі і адміністрацыяй прыносіць, зразумела, больш карысці, чым канфрантацыя.

Членамі вучонага савета, на якім разглядалася гэтае пытанне, было прынята рашэнне: ліст з адпаведным патрабаваннем накіраваць у Міністэрства абароны СССР і Дзяржкамітэт СССР па народнай адукацыі. Абяцанне выканана. Прыводзім поўны тэкст гэтага дакумента:

«Дзяржадукацыя СССР. Тав. Ягадзіну Г. А.

Рэктарат Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна інфармуе Вас аб тым, што прынятае Міністэрствам абароны СССР і Дзяржкамітэтам СССР па народнай адукацыі Указанне «Аб ваеннай падрыхтоўцы студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, звольненых з ваеннай службы» ад 23 мая 1989 года № 31-3 трактавана студэнтамі, звольненымі з радоў Савецкай Арміі да 1989 года, як праява сацыяльнай несправядлівасці да іх.

У сувязі з гэтым рэктарат Белдзяржуніверсітэта просіць прадаставіць вучонаму савету права самастойна вырашаць пытанне аб добраахвотнасці наведвання заняткаў па ваеннай падрыхтоўцы студэнтаў, звольненых у запас з Узброеных Сіл СССР».

ШТО НОВАГА?

## Бат Белая — «пазаштатнік»

Мінула пяць гадоў, як Бат Белая, скончыўшы вучобу ў Савецкім Саюзе, паехаў працаваць на радзіму — у Іарданію. Два тыдні назад ён прачытаў сваю першую лекцыю для студэнтаў аддзялення міжнароднай журналістыкі нашага універсітэта. Пакуль у якасці «пазаштатнага» выкладчыка. Ні выкладчыку, ні аўдыторыі гэтая акалічнасць нікольк не перашкаджала. Магчымасць правядзення лекцыі «Інфармацыя на радыё і тэлебачанні (на прыкладзе Іарданіі, у параўнанні з іншымі краінамі)» на арабскай мове з'явілася дзякуючы курсам павышэння кваліфікацыі для выпускнікоў-замежнікаў. На факультэт журналістыкі ў гэтым годзе прыехала 11 чалавек. Сярод іх работнікі цэнтральных органаў друку, галоўны рэдактар Агенцтва друку Гвінеі, два выкладчыкі журналісцкіх дысцыплін.

Вучэбны план курсаў быў падрыхтаваны загадзя — яшчэ ў мінулым годзе. Улічвалася ўсё: і тыя змены, што адбыліся ў нашай краіне, і новыя павевы беларускай журналістыкі.

З якой мэтай праводзяцца курсы?

Намеснік дэкана факультэта журналістыкі па рабоце з замежнымі студэнтамі Ангеліна Аляксандраўна Рудэнка лічыць, што патрэбны яны абодвум бакам не толькі для таго, каб не перарывалася сувязь паміж студэнтамі-замежнікамі і факультэтамі.

— У сябе на радзіме кожны наш выпускнік з'яўляецца чалавекам, які бачыў уласнымі вачыма Савецкі Саюз. Цяпер, калі ва ўсім свеце такім вялікім стаў інтарэс да нашай краіны, да іх звяртаюцца за тлумачэннямі, патрабуюць адказаў на складаныя пытанні.

Пакуль Бат Белая «пазаштатнік». Але, магчыма, у перспектыве на арабскай мове будзе гучаць не адна, а цыкл лекцый па радыё- і тэлежурналістыцы. А калі ўлічыць, што і рускай мовай выпускнікі універсітэта валодаюць нядрэнна, атрымліваецца, і савецкія студэнты змогуць вывучаць замежную журналістыку з першакрыніц.

М. ПАРХІМОВІЧ.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

## НЕ ГАВОРЫМ ПА-БЕЛАРУСКУ

Сёння ўсё часцей і часцей ідзе гаворка аб паглыбленым вывучэнні беларускай мовы. Датычыць гэта і нас, журналістаў. Ну як, скажыце, будзеце адчуваць сябе вы, прыехаўшы працаваць у раённую газету, якія большасцю выходзяць на беларускай мове, або на радыё ці тэлебачанні, дзе таксама аддаецца перавага праграмам, што гучаць па-беларуску. Безумоўна, няёмка.

Што ж прапануе нам родны факультэт? Па-беларуску чытаецца... беларуская мова. Усе астатнія дысцыпліны — на рускай.

У першы дзень заняткаў на арганізацыйным сходзе дэкан факультэта журналістыкі А. Г. Слука прапанаваў усім першакурснікам уступіць у Таварыства беларускай мовы. Сярод нас ёсць студэнты, якія не супраць падтрымаць гэту прапанову. Але з чым мы туды прыйдзем? У Статуце ТБМ запісана: «Таварыства лічыць, што справа сумлення і патрыятычнага абавязку кожнага беларуса, кожнага жыхара рэспублікі шанаваць і вывучаць беларускую мову, свабодна валодаць ёю, карыстацца ў штодзённым жыцці». На жаль, пра сябе мы гэтага сказаць не можам. Так што давайце выпраўляць уласныя памылкі разам. Таму прапаную правесці сустрэчу студэнтаў першага курса факультэта журналістыкі з прадстаўнікамі дэканата і выкладчыкамі. Тэма яе: «Пашырэнне ўжытку беларускай мовы ў вучэбным працэсе».

А. ЮРЫН,
студэнт факультэта журналістыкі.

ВЫ ЧУЛІ?

## Пра яшчэ адну

ўзнагароду на рахунку алімпійскага чэмпіёна К. Маджыдава. Камандар прывёз яе са швейцарскага горада Марціні. Не так даўно тут праходзіў 37-ы чэмпіянат свету па класічнай барацьбе, у якім прынялі ўдзел спартсмены больш чым з 40 краін.

Мацнейшай была зборная СССР. На яе рахунку — 5 залатых, 2 сярэбраныя і 2 бронзавыя ўзнагароды.

У перамогу савецкай барцоўскай дружыны вялікі ўклад унеслі спартсмены Беларусі. Асаблівая падзяка — выпускніку юрыдычнага факультэта Камандару Маджыдаву. Ён заваяваў залаты медаль у вагавай катэгорыі да 62 кг.

— Разумееце,— узбуджана гаварыў Камандар, адказваючы на шматлікія пытанні карэспандэнта «Советского спорта»,— паўднёвакарэйскі спартсмен «закрыўся» і разлічваў пратрымацца, а там — што суддзі скажуць. Змагацца з такім сапернікам проста немагчыма.

І ўсё ж беларускі спартсмен прыклаў усе свае намаганні і аказаўся на вышэйшай прыступцы п'едэстала гонару.

Удзельнічаў у чэмпіянаце і другі наш барэц — студэнт юрыдычнага факультэта Сяргей Дземяшкевіч. Толькі нехапіла вопыту перашкодзіў яму стаць прызёрам чэмпіянату свету.

З. МІХНЕВІЧ.

НУ І НУ!

*Лён палаў на нашых вачах. На такую долю ён быў асуджаны з самага пачатку — трэці (ці то чацвёрты) сорт ніякаму заводу не патрэбны. Не ведаючы ні расцэнак, ні нормы на дзень, ні таго, што працуем задарма, мы шчыравалі на полі калгаса «Рассвет» два тыдні. Атрымлівалася, гарэлі нашы мазалі, боль палаючых рук, спіны, якія пасля першых дзён працы ледзь разгіналіся.*

*Уласныя вочы запэўнівалі нас у тым, што працаваць старанна — дрэнна; лічыць калгасныя капейкі, латаючы прарэхі безгаспадарчасці,— сабе даражэй. А паколькі прадукцыйнасць працы развеялася разам з попелам таго пажарышча, у сярэднім зарабілі мы ад 4 да 20 рублёў. Пасля такога мінулагодняга ўрока гульні ў «добраахвотнасць», прабачце, не для нас.*

*Т. ГУЦАЛЕНКА,*
*студэнтка журфака.*

# АЎДЫТОРЫЯ № 7

Першая хваля публікацый і перадач, прысвечаных «памятнаму» дню выхаду рок-музыкі з падполля, згубіла сваю ранейшую моц.

Прайшоў пэўны час. Сапраўдныя таленавітыя музыканты, адданыя выбранаму шляху, набылі вялікую папулярнасць. Астатнія — зніклі ў моры падобных адзін на аднаго гуртоў.

Але за некалькі гадоў афіцыйнага існавання рок-культуры ўзровень музычнай крытыкі амаль не палепшыўся. Яскравых, кампетэнтных крытыкаў не чуваць.

«Аўдыторыя № 7» звяртаецца да ўсіх, хто аддае час і месца музычным перадачам і рубрыкам. Тэлебачанне, радыё, газеты і часопісы! Становішча музычнай крытыкі катастрафічнае. Матэрыялу з'явілася шмат, але ў большасці — гэта не крытыка, а канстатацыя існавання плюс уражанні.

Звяртаемся да вас. Няхай матэрыялаў будзе менш, але якасць і інфарматыўнасць іх — вышэй. Трэба змяняць адносіны да музычнай крытыкі.

Спадзяёмся, што наш заклік будзе пачуты.

У «Аўдыторыі» дзяжурыць
Зміцер ЛУКАШУК.




## З ПЯТАГА НА ДЗЕСЯТАЕ

...«Аўдыторыя № 7» кампетэнтна заяўляе: чуткі аб тым, што Арцём Цялегін паедзе з Мінска разам з «АВИА», не пацвердзіліся...

...Пры НПА «Цэнтр» створаны тэатр-студыя «Мроя». У яго састаў уваходзяць гурты «Мроя», «Рэй», «Хой».

...Ірландскі квартэт «Ю-ТУ» збіраецца ў новае турнэ...

...KISS пачалі работу над новай студыйнай пласцінкай.

...У Маскве прайшлі гастролі «Пінк Флойд».

## Што робім, хлопцы? — Тусуемся!

Школа ленінградскага рок-н-рола вядома не толькі ў нашай краіне, але ўжо і за мяжой. Рок-музыканты з берагоў Нявы займаюць верхнія радкі ў хіт-парадах. Карацей кажучы, Ленінградскаму рок-клубу рэклама не патрэбна.

А вось Мінскаму — відаць, неабходна як паветра. Таму што на сённяшні дзень мінскія меламаны не толькі не ведаюць гуртоў, якія туды ўваходзяць, але наогул і не чулі аб існаванні рок-клуба ў сталіцы Беларусі.

Вось адкажыце мне: каго вы ведаеце з беларускіх выканаўцаў, якія гурты? Адразу адкінем «Верасоў» і «Песняроў». Значыць, так: «Бонда», «Мроя», «Мясцовы час» — тры больш-менш вядомых. Далей, магчыма, хто назаве «Уліс», «Зарціпо», «Рэй» — яшчэ тры. Падумаўшы, прыбавім сюды «Магістрат», які з'явіўся не так даўно. І ўсё!

Цікава, што ніводзін з іх не ўваходзіць у Мінскі рок-клуб!!! А «Мясцовы час» дык і зусім з Полацка.

У чым жа справа? Прывяду такі прыклад. Некалі рок-гурт «Магістрат» уваходзіў у рок-клуб. Але ішоў час, хлопцы пачалі часцей выступаць, і рок-клуб ператварыўся для іх у абузу. Яны пакінулі яго. І зараз нядрэнна сябе адчуваюць, шмат гастралююць.

Тлумачэнне гэтаму адно: увесь сакрэт у камерцыйным дырэктары. Яго не бачаць гледачы, але яго справа заўсёды на вачах. Так, толькі дзякуючы намаганням менавіта камерцыйнага дырэктара мы час ад часу можам убачыць афішу-запрашэнне на канцэрт «Магістрата».

У Ленінградскім рок-клубе існуе традыцыя: жадаючым стаць яго членамі прапануюць прайсці экзамен — праслухоўванне. У выніку туды трапляюць толькі тыя, хто мае перспектыву росту. У Мінскім рок-клубе такое не практыкуецца. Таму тым, хто мае шанц, наш клуб і не перашкаджае, і не дапамагае.

На мой погляд, самым (альбо адным з...) моцным з'яўляецца гурт «Кондар», У іх узаемаразуменне на сцэне, нядрэнны вакал, вострыя тэксты, апрабаваны арт-рок з хардавымі ўстаўкамі — гэта вылучае гурт у лік самых перспектыўных. Застаецца папрацаваць над сольнымі партыямі, знайсці актыўнага камерцыйнага дырэктара, і — я ўпэўнены, поспех забяспечаны.

Усё новыя гурты пакідаюць рок-клуб. Не так даўно гэта зрабіў «Экстратон», які працуе ў стылі «Новая хваля». Частка яго музыкантаў улілася ў гурт «Макіяж», створаны Арцёмам Цялегіным.

Як змяніць сітуацыю? Давайце звернемся да вопыту Ленінградскага, Свярдлоўскага рок-клубаў, Маскоўскай рок-лабараторыі. Хопіць вучыцца толькі на ўласных памылках! Давайце або працаваць па-сапраўднаму, або зусім не брацца за гэтую справу, каб не збіваць з панталыку маладых музыкантаў, не кампраметаваць рок-рух.

ДЫСАНАНС

# КАНЦЭРТ НЕ АДБЫЎСЯ, АЛЕ...

інтэрв'ю ў Жэні Белаусава ў час яго нядаўняга прыезду ў Мінск я ўзяў

*Няма неабходнасці прадстаўляць гэтага маладога (10 верасня яму споўнілася 21 год) спевака: песні «Дзяўчынка мая сінявокая», «Начное таксі», «Алушта», «Такое кароткае лета» сталі шлягерамі, як толькі прагучалі па тэлебачанні і радыё. Многа палемічнага ў тым, што стварае Белаусаў: мне здаецца, не вытрымлівае ніякай крытыкі славеснае напаўненне «Дзяўчынкі» — своеасаблівага «лэйбла» на песенным тавары Жэні. Магчыма, без гэтай песні папулярнасць спевака не была б настолькі ашаламляльнай, але менавіта яе вылучае невялікі розум. Шкада, бо ў жыцці Жэня Белаусаў выклікаў уражанне намнога лепшае, чым на тэлевізійным экране.*

— Жэня, некалькі слоў пра сябе...

— Нарадзіўся ў Харкаве ў сям'і вайскоўца. Школу і музычнае вучылішча скончыў у Курску, дзе потым працаваў два гады ў розных музычных калектывах. У восемдзесят другім годзе пазнаёміўся з Любоўю Варапаевай і Віктарам Дарохіным. Гэта знаёмства і прадвызначыла мой сённяшні дзень.

— А як ставяцца бацькі да таго, чым ты займаешся?

— Яны лічаць гэта не да канца сур'ёзнай работай. Для іх сур'ёзна — калі працуеш на дзяржаўным прадпрыемстве, дзе можна зарабляць на пенсію.

— Сёння — пік тваёй папулярнасці: тры месяцы ты ўзначальваеш айчынны музычны Алімп...

— Гэта толькі стартавы разбег. Нічога ж яшчэ не адбылося.

— Што ж, добры пачатак... А твой падыход да адбору песень?

— На першым месцы — музыка, каб чалавек меў магчымасць хоць на гадзіну пакінуць убаку брыдоту, складанасці жыцця. Я не падзяляю творчых ідэй тых артыстаў, якія спяваюць песні на перабудовачныя, вострасацыяльныя тэмы. Чалавек дастаткова стаміўся і на рабоце, і ў чарзе ў магазінах, дзе нічога няма. Ён прыйшоў на канцэрт адпачыць. Я прыхільнік таго, каб на сцэне было свята. Імкнуся, каб на маіх канцэртах чалавек жыў у нейкім рамантычным свеце.

— Ці азначае гэта, што ты не зусім station ацэньваеш творчасць, скажам, Шаўчука, Цоя?

— Не! Няма сумненняў — такая музыка патрэбна. Але хіба ж так неабходна, каб з экрана тэлевізара (асабліва калі ідзе праграма «Взгляд») гучалі толькі песні барацьбы? Так, у іх «моцныя» тэксты. Праўда, са «слабым» музычным фонам. Усё вельмі непрафесійна, на мой погляд. Нават, калі ёсць ідэя, настрой, а чалавек няправільна пяе па нотах, ці проста «не строіць» гітара — адразу знікае жаданне слухаць. Ва ўсякім разе ў мяне.

— Ты прытрымліваешся тэзіса «чыстага мастацтва»?

— Што ты! Мастацтва дзеля мастацтва — гэта нейкая арыгінальная авангардысцкая музыка, якую разумеюць толькі тыя, хто яе стварае. Тое, чым займаюся я,— відавочна камерцыйная музыка. Музыка, пры стварэнні якой прымаецца пад увагу тое, што яна павінна спадабацца слухачам. Падлічваецца ўсё, нават кожны музычны зварот, каб песня стала шлягерам.

— А цябе не палохае, што ў тваіх песнях няма пасылу на глыбіню думак?

— Не, я ж сказаў, што гэта не самамэта. Тым больш, што ўсё яшчэ наперадзе.

— Наступнае пытанне, на першы погляд, выпадковае: як ты ставішся да творчасці «Ласкового мая»?

— У іх ёсць многа станоўчага: запамінальная мелодыя, своеасаблівая манера выканання, але мяне аддаляе непрафесійнасць аранжыровак, спеваў. Часам гэта гучыць, як жалезам па шкле.

— А тое, што на афішах ты «Белаусаў Жэня»,— твая знаходка, састаўная іміджу?

— Пачалося ўсё з таго, што мне проста не падабаецца імя Яўген (смяецца і дэкламуе: Яўген Белаусаў). Па-мойму, лепш Жэня. Гэта бліжэй да майго ўзросту, іміджу, тым больш, што прыйдзе яшчэ час, калі я стану Яўгенам Віктаравічам.

— Твае планы на бліжэйшы час?

— Цяпер выходзіць сольны дыск-гігант. Да таго ж запісваю магнітафонны альбом. Хачу крыху змяніць стыль. Музыка, зразумела, застанецца камерцыйнай. А далей... Я чалавек прымхлівы, таму не скажу, што збіраюся змяніць.

У той вечар Жэня меў вольны час. На пытанне, што будзе рабіць, адказаў: «Хачу пайсці на рыбалку».

*Дарэчы, вольным у яго быў і наступны дзень — канцэрты Жэні Белаусава ў Мінску не адбыліся.*

*Што ж здарылася? Па дагаворы пры пасрэдніцтве кааператыва Жэня Белаусаў і група «Комбинация» павінны былі даць у Мінску чатыры канцэрты, за што і абавязалася філармонія выплаціць 50 працэнтаў дагаворнай сумы да канцэртаў і астатнія 50 працэнтаў — пасля заканчэння. Заставалася гадзіна да першага канцэрта, аднак адміністрацыя філармоніі не думала плаціць. Артысты толькі што «апякліся» у Пінску, дзе, адпрацаваўшы ўсе дагаворныя абавязацельствы, грошай так і не атрымалі. таму зусім лагічна, што Белаусаў і яго група адмовіліся выступаць: дагавор парушаны філармоніяй. Ды і яе прадстаўнік Л. А. Бажко, па словах Жэні, вёў сябе некарэктна, а гледачам паведамілі, што канцэрты адмяняюцца не па віне адміністрацыі. Агонь незадаволенасці гледачоў быў накіраваны на Белаусава. Белае назвалі чорным.*

*Такую вось кашу прыгатавалі мясцовыя чыноўнікі ад культуры. Так што ў адмене канцэртаў быў вінаваты зусім не дождж.*

*Сяргей ШАПРАН.*

ЗНАЁМЦЕСЯ

# ПАВАДЫР



Няма сумненняў, вы беспамылкова пазналі на фотаздымку Алеся Камоцкага. І, напэўна, шмат хто здзівіўся, убачыўшы рубрыку. Але мы не памыліліся. Імя Алеся вядома слухачам не толькі як саксафаніста рок-гурта «Зарціпо», але і як барда. Большасць нават лепш ведае яго ў другой якасці. Менавіта пра Алеся «у другой якасці» і пойдзе зараз гаворка.

У апошні час Алесь Камоцкі больш-менш рэгулярна пачаў выходзіць да слухачоў са сваімі сольнымі канцэртамі. Што ж уяўляюць сабою песні Алеся? Калі паглядзець на яго творчасць з боку музычнай афарбоўкі, давядзецца шчыра прызнаць, што яна не выдзяляецца багаццем і яскравасцю. Але цудоўная, захапляючая меладычнасць згладжвае беднасць музычнай афарбоўкі. Плюс да гэтага простыя, лёгкія, вясёлыя тэксты, напісаныя на прыгожай і чыстай беларускай мове. У словах, здаецца, б'е крыніца народнага гумару. Пасля яго песень душа нібыта ажывае. Хочацца хаця б падзякаваць за песні на роднай мове.

Акрамя таго за прастатой і весялосцю Алесевых песень добра чутны роздум над пытаннямі і клопатамі, якія хвалююць сучаснага чалавека. І ў першую чаргу бяздушнасць тых, побач з кім ты ідзеш.

Таму давайце спынімся і ўважліва паслухаем Алеся Камоцкага. Пазнаёмімся, падумаем.

Так, мы не памыліліся, паставіўшы рубрыку «знаёмцеся». Знаёмцеся з Алесем Камоцкім, з яго новымі песнямі «Рэклама фенолфталеіну», «Птушкі і гнёзды», «Заводзім гаспадарку», знаёмцеся з роднай моваи, з гісторыяй, з тым, хто побач, з самім сабою.

Сапраўдны музыкант ніколі не стаіць на месцы, ён заўсёды ў пошуку. Погляд на жыццё, на творчасць, на грамадства, на стан і духоўны патэнцыял Чалавека ў Алеся арыгінальны.

«Аўдыторыя № 7» плануе працяг знаёмства з А. Камоцкім. Сачыце за выхадам «Беларускага універсітэта».

Матэрыялы паласы
падрыхтаваў да друку
Зміцер ЛУКАШУК.

НА НЕКАЛЬКІ СЛОЎ

# СВОЙ ХЛОПЕЦ

31 жніўня Арцёму Цялегіну споўнілася дваццаць. Многа гэта ці мала? Арцём лічыць, што гэта вельмі многа.

Мы сядзім на кухні і смакуем гарбату. Цялегін трымае на каленях сваю гітару. Мы з ім старыя сябры. Пры кожнай сустрэчы, якія бываюць, на жаль, не так часта, ён абавязкова бярэ ў рукі гітару — паказаць новую песню. Гэта прыемна. Песня часцей за ўсё з'яўляецца працягам размовы: маўляў, вось, паслухай мае думкі наконт гэтага пытання. Ён пачынае іграць, і час знікае.

У кожнага ёсць права на асабістую думку. Ды хвалюе мяне зараз іншае. Ужо не толькі мэтры беларускага друку вядуць музычныя старонкі, але і шматтыражныя выданні звяртаюцца да гэтай тэмы. Той, хто цікавіцца, інфармацыі мае шмат. Але якой якасці? У пераважнай большасці матэрыялаў няма глыбіні, прафесійнага крытычнага разгляду як музыкі, так і вершаў.

...Зніклі словы, змоўклі гукі. Мы з Арцёмам пачалі новую гутарку. Але гэта ўжо іншыя песні...

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвона зорка» МВПЛ імя Я. Коласа.
28 верасня
Зак. 1631.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.